**Райчонак, С.** Асноўнай задачай была ахова пераправы / С. Райчонак // Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). — 2014. — 25 студз. — С. 2.

# АСНОЎНАЙ ЗАДАЧАЙ БЫЛА АХОВА ПЕРАПРАВЫ



Алег Яўгеньевіч Абрамачкін нарадзіўся і вырас у Калужскай вобласці былой РСФСР. Закончыўшы саўгас-тэхнікум, у 1986 годзе прызваўся на тэрміновую службу, якую праходзіў у пагранічных войсках на Паміры. Загадам камандавання ў 1987 годзе Алег Абрамачкін накіраваны ў Афганскую рэспубліку. Асноўнай задачай пагранічнікаў была ахова рачной пераправы, па якой дастаўлялася матэрыяльнае забеспячэнне асобных часцей савецкіх войск. Неаднаразова душманы рабілі спробы па захопу маста і яго ліквідацыі, але пагранічнікі паспяхова адбівалі вылазкі непрыяцеля. Алег Яўгеньевіч успомніў такі цікавы факт, што ахоўваемы імі мост быў сканструяваны адным з афганскіх інжынераў-будаўнікоў, які калісьці атрымаў прафесійную адукацыю ў Савецкім Саюзе, а ў час вайны апынуўся на баку душманаў, і сам прадпрымаў дзеянні па падрыву пераправы, якія так і засталіся не рэалізаванымі.

Лёс распарадзіўся такім чынам, што Алегу Яўгеньевічу давялося ваяваць у яшчэ адной «гарачай кропцы» – у Нагорным Карабасе.

– Калі знаходзішся побач са смерцю, – кажа наш суразмоўца, – пераасэнсоўваеш сваё жыццё, свае погляды, уласнае светаўспрыманне. Пачынаеш зусім па іншаму глядзець на блізкіх табе людзей, на грамадства ў цэлым.

Тры гады назад Алег Яўгеньевіч змяніў месца жыхарства і пераехаў у Шаркаўшчыну. Зараз ён працуе ліфцёрам у цэнтральнай раённай бальніцы. Але ж успаміны аб той жудаснай вайне назаўсёды засталіся ў памяці салдата, які сярод тысяч савецкіх юнакоў з годнасцю выканаў свой воінскі абавязак перад Радзімай.

**Сяргей Райчонак,**
**фота аўтара**